Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

17-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII год выданьня штодзённая газэта

НЯДЗЕЛЯ 20 ЛІСТАПАДА 1932 г.
№ 256 (3625)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-69
Адказн. сакратара 4-78
Сэктароў . . . 6-15
Начная рэдакцыя 12-65 (два званкі)
Выдавецтва . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на пошце ліставосцямі.
Рукапісы не звяртаюцца.

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

ОШТ АБ'ЯВЫ радок нонпарэлі 1 руб.
КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ 1 дакумэнту аб згубе 2 руб.

Сеньня у нумары:

ПЕРАДАВЫ: Тварам да збожжаза гатовак.
БУЛЬБА—ЛЕНІНГРАДУ: Зламаць дэмабілізацыйныя настроі (1-ая стар.).
Бальшавікі заводу імя Домбаля, вы павінны даабіцца пераломі у рэалізацыі пазыкі (1-ая стар.).
Наш адказ на пастанову ЦВК і СНК СССР (1-ая стар.).
ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ: Жлобін здае тэмпы (1-ая стар.).
ДЭПУТАЦКІЯ ГРУПЫ на штурм прарываў утыльцэхаў (4-ая стар.).
УЗМАЦНІЦЬ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ ДЭПУТАЦКІХ ГРУП ДЛЯ ПАСЬПЯХОВАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ПАХОДУ САВЕТАЎ (4-ая стар.).
Лёнапрадукцыю — сацыялістычнай прамысловасьці (4-ая стар.).
Зварот да працоўных усяго сьвету амэрыканскай рабочай дэлегацыі (4-ая стар.).
ПА БССР (4-ая стар.).
ЗА ГРАНІЦАЙ (4-ая стар.).

Саветы--тварам да збожжазагатовак

Там, дзе партыйныя арганізацыі, дзе саветы зразумелі ўсю гаспадарча-палітычную важнасьць здачы дзяржаве збожжа, там дзе масавая работа вялася няўстанна, дзе націск на кулака не паслабляўся, пакуль цьвёрдыя заданьні ня былі выпаўнены—збожжазагатоўкі ўжо закончаны. Толькі ўчора мы падавалі заслугоўваючыя ўвагі факты ўзорнай бальшавіцкай барацьбы за збожжа. Калгасы Бобрыскага сельсавету, Крупскага раёну (у асаблівасьці калгас «Перамога»), дзякуючы разгорнутай масавай рабоце, прачыльнай расстановцы сіл, сацыялістычнаму спаборніцтву перавыканалі гадавыя пляны. Сельсавет зразумеў што, посьпех загатовак будзе забясьпечаны толькі ва ўпартай клясавай барацьбе. І нічога дзіўнага няма ў тым, што пры правядзеньні збожжазагатовак былі выяўлены клясава-варожыя элементы ў праўленьні калгасу «Альтінкі».

У барацьбе за збожжа члены сельскіх саветаў, лепшыя актывісты і рад раённых паказалі ўзор ударнай работы. Вось прыклад работы члена Лучынскага сельсавету тав. Гарбатава. На яго вучастку ня толькі калгасы, але і адасобныя з гонарам справіліся з заданьнем ня гадовага выкананьня пляну. Трэба проста заявіць, што слабыя тэмпы збожжазагатовак апрача цэлага раду суб'ектыўных прычын тлумачацца слабой масавай работай саветаў і іх органаў. Сёньня мы зьмяшчаем карэспандэнцыю са Жлобіна, якая дае характарыстыку дрэннай работы раду саветаў па збожжазагатоўках. Дабрагашчанскі сельсавет ніяк ня можа абыйсьціся без дапамогі раёну, і як толькі скрыўся з вачей апошні вагон цягніка, у якім сядзела выязная рэдакцыя раённай газэты, сельсавет і яго работнікі пасьпяшаліся скласьці зброю. За 10 дзён дабрагашчанцы не здалі ніводнага кілё збожжа. Што думалі раённыя арганізацыі Жлобіншчыны, калі абвяшчалі раённы конкурс? Няўжо РВК думае, што пралетарская грамадзкасьць ня будзе рэагаваць на разыходжаньне паміж словамі і справай. Мы патрабуем адказу, чому за адну дэкаду раён ня даў ні волнага процанту прыросту?

У ліку тых мерапрыемстваў, якія павінны быць безадкладна праведзены для рашучага зруху ў збожжазагатоўках, работа саветаў мае першачарговае значэньне. Трэба безадкладна ажывіць работу камісій сядзеньняскіх, на пленумах РВК і сельсаветаў абмеркаваць пытаньне аб становішчы збожжазагатовак. Мы думаем, што аргад дзел ЦВК БССР прыме адпаведныя меры да лініі арганасадзелаў. Посьпех будзе забясьпечаны тады, калі пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый усе сілы саветаў, шматлікасьць савецкі актыў будзе кінуты на фронт барацьбы за збожжа. Інтарэсы рабочага забясьпечаньня, неадкладныя патрэбы дзяржавы, пэрспэктывы калгаснага буксіру. Аналіз ходу загатовак па Чэрвеньшчыне і Шклоўшчыне гэта цэлкам і поўнасьцю падцьвярджае.

Барацьба за збожжа—клясавая барацьба. Супраціўленьне кулацтва, ан ідзяржаўныя тэндэнцыі, апартуністычныя настроі зрываюць выкананьне ня плянавых заданьняў дзяржавы. Ці можа быць цярпіма такое становішча, калі і зараз, пасьля таго, як прайшлі ўсе тэрміны, цьвёрдыя заданьні яшчэ не спаўнены. У радзе раёнаў (у прыватнасьці Смалявіцкім) саветы праяўляюць выключную мяшкакарактарнасьць і гнілы лібэралізм у адносінах да сабатажніцкай збожжазагатовак. Чым растлумачыць тое, што за апошні час мы ня маем судова-паказальных працэсаў над злоснымі зрыўшчыкамі загатовак, што паасобныя факты націску на кулака не папулярызуюцца. Зразумела, што гэта ўсё выяўляецца ўсёкосным патураньнем кулаку ў боку чыншоўнікаў і апартуністаў, якія прымазаліся да дзяржапарату.

Мабілізацыя працоўных мас супроць кулака, адміністрацыйнымі і судовымі мерамі прымусіць кулацка-заможную гаспадарку аддаць збожжа дзяржаве. Цьвёрдыя заданьні павінны быць запрыманы ў мінімальна ўшчыльненым тэрміны.

Вялікае месца ў стымуляваньні здачы збожжа за апошні час займала планамерная барацьба за ўзмацненьне таваразабясьпечаньня вёскі, за нармальны ход адгрузак тавараў у вёску. Вёска атрымала шмат тавараў за кошт зьмяншэньня завозу тавараў у горад і ўнутрыпрамысловага спажываньня.

Партыя ня раз падкрэсьлівала, што ўсё забясьпечаньне, савецкі гандаль на вёсцы павінны быць пабудаваны на службу здачам сацбудаўніцтва. Вось чаму не павінна паслабляцца барацьба з мэханічным разьмеркаваньнем тавараў па прыцінках бальшавікоў. Савецкі гандаль на вёсцы павінен ісьці ў адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва і выкананьня дзяржаўных загатовак. Больш тавараў і лепшай якасьці прадаваць у тых вёсках і калгасах, якія пасьпяхова вядуць барацьбу за збожжа.

У збожжазагатоўках павінен надыйсьці рашучы пералом. Саветы, дэпутацкія групы, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, вядучы рашучую барацьбу з «права-апартуністычнымі элементамі і «левакамі» павінны дамагчыся выкананьня агульнадзяржаўнага пляну збожжазагатовак у тэрміны, вызначаныя партыяй.

Саветы—тварам за збожжазагатовак!

Бульба—Ленінграду

ЗЛАМАЦЬ ДЭМАБІЛІЗАЦЫЙНЫЯ НАСТРОІ

9,6 процантаў выканаць у тры дні

Ударыць па апартуністычным самацёку

БАБРУЙСК. 19-XI. (Па тэлеф. ад наш. кар.). Апошнія дні далі рэзкае зьніжэньне тэмпаў адгрузкі бульбы Ленінграду. Калі 16 лістапада было адгружана Ленінграду 400 тон бульбы дык 17 лістапада адгружана толькі 160 тон, 18 лістапада—219 тон.

На 19 лістапада плян адгрузкі бульбы раён выканаў толькі на 77 проц.

Зьніжэньне тэмпаў адгрузкі тлумачыцца слабой падвозкай бульбы да чыгункі, што ў сваю чаргу тлумачыцца слабым разгортваньнем бульбазагатовак. Плян бульбазагатовак па раёне выкананы ўсяго на 73,2 проц.

Асобныя сельсаветы, як, напрыклад, Берасьвенскі, Гарадзецкі, Вешчанскі і рад іншых за апошнія дні амаль зусім спынілі загатоўкі бульбы.

Зьніжэньне тэмпаў загатовак ставіць пад пагрозу выкананьне пляну адгрузкі бульбы Ленінграду. Апартуністычны самацёк у загатоўках павінен быць зараз-жа ліквідаваны. Загатоўчыя арганізацыі Бабруйшчыны па вінны забясьпечыць неадкладную адгрузку Ленінграду 1500 тон бульбы.

ДАМБРОЎСКІ

* * *

Гэта—агіднейшае зьявішча. Бабруйскія арганізацыі неразуменьнем дырэктыў партыі і ўраду аб адгрузцы бульбы Ленінграду паказалі твар апартунізму.

Чым-жа выклікана такое рэзкае зьніжэньне тэмпаў адгрузкі? Уся справа ў тым, што Бабруйскія арганізацыі самі ня хочуць цраявіць патрэбнай актыўнасьці і ініцыятывы.

У той час, калі прыезд у раён сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гікало выклікаў масавы энтузіязм шырокіх мас калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў Бабруйшчыны на хутчэйшае выкананьне пляну адгрузкі бульбы, калі працоўнае сялянства раёну арганізавала патокі чырвоных абозаў з бульбай ленінградзкім рабочым, калі непасрэдным бальшавіцкім апэрацыйным кіраўніцтвам тав. Гікало тэмпы бульбаадгрузкі былі значна ўзьняты.—Бабруйскія арганізацыі не змаглі замацаваць гэты зрух. Яны пасьля ад'езду з раёну тав. Гікало пусьцілі адгрузку бульбы на апартуністычны самацёк.

Гэтага дапусьціць ні ў якім разе нельга. Яны дэмабілізацыйных настроях, па апартуністычных разважаньнях—«усдроўна не пасьпеем выканаць плян»—трэба моцна ўдарыць.

Бабруйскі РК КП(б)Б і РВК абавязаны зараз-жа ўзьняць тэмпы адгрузкі, дабіўшыся сканчэньня не ў два-тры дні.

Высунулі сустрэчны

СМАЛЯВІЧЫ. (Наш. кар.). Калгасьнікі калгасу імя МОЛАТАВА, заслухаўшы на пашыраным паседжаньні праўленьня калгасу пытаньне аб адгрузцы бульбы рабочым гор. Леніна і прымаючы пад увагу, што раён га небна адстае—высунулі сустрэчны плян па здачы бульбы на 45 проц. больш вызначанага заданьня.

Апроч гэтага 20 лепшых калгаснікаў з атрыманай імі бульбы па працадзнёх здалі 74 пуды для адгрузкі Ленінграду і выклікалі ўсе калгасы раёну пасьледваць іх прыкладу. П. К.

200 тон бульбы звыш пляну

ДЗЯРЖЫНСК. 14 лістапада пашыраны прэзыдыум РВК з удзелам старшынь сельсаветаў, калгасаў і іншых арганізацый вынес пастанову адгрузіць пралетарам Ленінграду 200 тон бульбы звыш пляну.

Старшыні сельсаветаў і калгасаў тут-жа ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы і абяцалі на працяту блізкэйшых дзён цалкам адгрузіць пакаданую колькасьць бульбы.

46 чалавек раённага і сельскага партактыву пасланы ў калгасы і вёскі для арганізацыі чырвоных абозаў, правядзеньня масавай работы сярод калгаснікаў, беднякоў і серадняковаў-адна асобнікаў. (Белта).

Адгружана па БССР бульбы Ленінграду на 19 лістапада (у тонах)

За дзень	З пачатку кампаніі	Проц. выкананьня пляну
3494,5	172,536	90,4

У падарунак пралетарам Ленінграду

БАРЫСАЎ. (наш кар.). На 17 лістапада плян адгрузкі бульбы Ленінграду выкананы на 81,9 проц.

Белпладгароднына адгрузіла 1708 тон з напрэбных адгрузіць 2164 тоны. Райсаюз адгрузіў 1190 тон, што складае 86,7 проц.

У адзнаку знаходжаньня ў Барысаўшчыне сакратара ЦК КП(б)Б тав. Жаброўскага калгасы і сельсаветы адгружаюць бульбу і збожжа ў падарунак пралетарам Ленінграду.

Так, калгасьнікі *Зембінскага* сельсавету адгрузілі в неабагу ленага фонду *1000* пудоў бульбы і 4 цэнтнэра збожжа.

Зембінскі сельсавет увесь час цяпнуўся ў хвасьце па выкананьні пляну адгрузкі бульбы Ленінграду. Але пасьля націску з боку раённых арганізацый і пры дапамозе высланай брыгады *Зембінскі* местачковы савет дасягнуў перамогі на фронце бульба і збожжазагатовак. На 17 лістапада плян бульбазагатовак выкананы поўнасьцю. Таксама выкананы поўнасьцю плян збожжазагатовак.

Зембінцы зьвярнуліся з заклікам да ўсіх сельсаветаў раёну па сьледваць іх прыкладу.

П. Я-ч

Раўняцца па калгасе „Полымя“

Рагачэў. (Наш кар.). Калгас *«Полымя», Бабалаўскага* сельсавету, атрымаў буйнейшую перамогу на фронце бульбаадгрузкі. Пляновае заданьне па адгрузцы бульбы пралетарыяту гораду Леніна калгас *«Полымя»* выканаў на 155 проц.

Калгас на чале са старшынёй т. *Сімаховым* тэтых дасягненьняў дамогся толькі дзякуючы добра пастаўленай палітычна-выхаваўчай работы сярод калгаснікаў.

Калгас *«Полымя»* выканаў так сама плян збожжазагатовак на 100 проц., плян загатовак тэх культур—на 104 проц.

Кулешоў Хв.

Не паслабляць барацьбы за бульбу

Жлобін. (Наш кар.). Мабілізацыя ўсяго раённага партактыву, рашучы пералом у рабоце мясцовых партячэек і сельсаветаў—забясьпечылі перамогу ў адгрузцы бульбы Ленінграду. Плян адгрузкі на 10 лістапада быў выкананы (105 проц.).

Але даасягнуўшы гэтай перамогі раённыя арганізацыі паслабілі кіраўніцтва загатоўкай бульбы. Зараз ў раёне панае дэмабілізацыйны настрой. Гэта ў той час, калі агульны плян бульбазагатовак выкананы толькі на 46,5 проц., а аднаасобным сэктарам на 35,7 проц.

Паасобныя сельсаветы правальваюць загатоўкі. Кароткаўскі сельсавет выканаў плян толькі на 12,3 проц., Малевіцкі—на 20,5 проц., Нова-Маркаўскі—на 24,4 проц. і г. д.

Калгасы раёну паказваюць прыклад у выкананьні сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Яны набліжаюцца да поўнага выкананьня пляну (90 проц.). Калгасы Майскага сельсавету выканалі плян бульбазагатовак на 291 проц., Каганаўскага—на 201 проц., Сасюнскага—на 109 проц., Папараўнянскага—на 129 проц. Да дня XV гадавіны Каст рычніка ў падарунак ленінградзкім рабочым гэтыя калгасы адгрузілі бульбу звыш пляну.

Па гэтых перадавікох павінен раўняцца ўвесь раён. Раён не павінен спыняцца на поўным выкананьні пляну адгрузкі бульбы, але ўдарным завяршэньнем бульбазагатовак грузіць бульбу Ленінграду звыш пляну.

Закрэўскі

Бальшавікі завода імя Домбаля,

вы павінны дабіцца пералому ў рэалізацыі пазыкі

Домбалеўцы павінны ліквідаваць адставаньне

БАРЫСАЎ. Рэалізацыя пазыкі «4-ты завяршаючы» па шклозаводзе імя Домбаля складае ўсяго 60,4 проц.

Дзе прычыны такога нізкага процанту? Хто канкрэтна адыўшчыкі гэтай справы? Што робяць заводзкія арганізацыі для поўнага выкананьня рэалізацыі пазыкі?

Для адказу на гэтыя пытаньні даем слова брыгадзе, якая праверыла становішча рэалізацыі пазыкі на заводзе.

— «На першае наша запытаньне—чому такі нізкі процант рэалізацыі пазыкі, сакратар партакалектыву Кавальчук, старшыня заўкому Леановіч, сакратар камсамольскага калектыву Ратнэр і сакратар заводзкага камсоду Ціхановіч у адзін голас адказалі: «Што-ж, дзякуючысь рабочай сілы, нічога не паробіш».

Але пры праверцы аказалася зусім іншае. На заводзе сталых рабочых працуе 963 чал., з іх ахоплена падпіскай усяго 591 чал. Месячны фонд зарплаты складае 78485 руб., а пазыка рэалізавана толькі на 67050 руб. За апошнія 2-3 месяцы на завод прыбылі новыя рабочыя, але яны таксама засталіся не ахопленымі падпіскай на пазыку.

Агульна-заводзкі камсод у асобе старшыні Ціхановіча бязьдзейнічае, а гледзячы на яго бязьдзейнічаюць і цэхавыя камсоды. Улік у рабоце камсоду пастаўлены надзвычайна дрэнна. Як мы ня мікнуліся дабіцца—хто ашчэ не ахоплены падпіскай, так нам і не ўдалося даведацца.

«Ну што-ж тут асаблівага, калі на 5-10 проц. і недавыканаем плян рэалізацыі пазыкі»—як быццам пут і сапраўды асаблівага нічога няма,—разважае бухгальтар заводу Кайнер.

Трэба сказаць, што вось такімі «кантараўскімі» разважаньнямі і жывуць кіраўнікі заводу.

Што канкрэтна ў бліжэйшыя дні ўжыве кіраўніцтва заводу да хутчэйшай рэалізацыі пазыкі, нам даведацца не ўдалося. Што-ж, будзем змагацца... гаварыць яны.

Такім апартуністычным адносінам заводзкіх арганізацый шклозаводу імя Домбаля да рэалізацыі пазыкі «4-ты завяршаючы» патрэбна зараз-жа пакласьці канец. Раённы камітэт партыі павінен прымусіць кіраўнікоў заводу імя Домбаля ў бліжэйшыя-ж дні на основе шырока праведзенай масавай работы цалкам завяршыць рэалізацыю пазыкі «4-ты завяршаючы».

Кіраўніцтва шклозаводу імя Домбаля павінна зразумець, што барацьба за фінплян, за хутчэйшую рэалізацыю пазыкі зьяўляецца ня менш важнай барацьбой, чым барацьба за выкананьне вытворчай праграмы заводу.

П. Я—ч.

Выклікем на сацспаборніцтва Барысаўскую гарпайашчадкасу

Адзначаючы значныя дасягненьні ў пытаньні мабілізацыі сродак і рэалізацыі пазыкі нельга абыйсьці моўчкі пытаньня як-жа пастаўлена справа ў нас з абслугаваньнем пазыкатрымальнікаў? На вялікі жаль становішча з абслугоўваньнем пазыкатрымальнікаў пастаўлена вельмі дрэнна. Часта падпісчык доўгі час ня можа дабіцца ня толькі атрыманьня замацавальных талёнаў, але нават і выкупленых аблігацый, а гэтым самым ён на доўгі час пазбаўляецца магчымасьці карыстацца выгодамі дзяржпазыкі (выйгрышы па тыражох).

У інтарэсах палепшаньня абслугоўваньня падпісчыкаў на пазыку «4-ты завяршаючы год пяцігодкі» калектыў работнікаў Полацкай рай. гарашчадкасы выклікае на сацспаборніцтва Барысаўскую ашчадкасу па наступных паказьніках:

Зараз-жа прыступіць да замацаваньня аблігацый «4-ты завяршаючы» за падпісчыкамі і скончыць гэтую работу не позьней 15 сьнежня 1932 году. Раздачу замацавальных талёнаў вываразіць праз адміністрацыю прадпрыемстваў, устаноў па меры замацаваньня.

Правесьці інструкцыйныя нарады камсодаў і прадстаўнікоў адміністрацыі па раздачы замацавальных талёнаў падпісчыкам на рукі.

Вылучыць брыгады для правядзеньня пэрыядычных праверак устаноў і арганізацый, калгасаў аб становішчы з раздачай талёнаў падпісчыкам.

У пэрыяд замацаваньня аблігацый сваячасова дасылаць весткі кіраўніцтву ашчадкасам.

Па сканчэньні замацаваньня аблігацый сіламі саюзу фінбанкаўскіх работнікаў, правесьці праверку ўсіх арганізацый і ўстаноў гораду і вёскі аб становішчы раздачы замацавальных талёнаў пазыкі «4-ты завяршаючы» на рукі падпісчыкам.

У пэрыяд замацаваньня аблігацый ахапіць сапумовамі ня менш 60 проц. складу работнікаў рай-гарашчадкасы.

Сацдагавор заключаем на тэрмін да 1-га студзеня 1933 году. Арбітрам выкананьня сацдагавору абіраем Полацкі і Барысаўскі райМК фінбанкаўскіх работнікаў, кіраўніцтва ашчадкасамі БССР і рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь».

На даручэньні калектыву работнікаў Полацкай рай. гар. ашчадкасы (ідуць тры подпісы).

Зводка ходу выкананьня каса ага квартальнага пляну па пазыцы „4-ты завяршаючы“

(Паводле вестак на 10 лістапада 1932 г. у проц.)

Ідуць упередзе:

Ельскі	56,4
Лепельскі	46,5
Лёзьненскі	42,8
Менскі	43,9
Мсьціслаўскі	38,2
Аршанскі	38,2

Цягнуцца ў хвасьце:

Кармянскі	2,7
Брагінскі	7,3
Прапойскі	9,6
Старадароскі	3,8
Нараўлянскі	12,3
Бялыніцкі	13,0
Чэрвеньскі	15,09
Талачынскі	12,1
Уваравіцкі	5,0
Парыцкі	5,5
Дубровеньскі	13,0
Асіпавіцкі	18,3
Б.-Кацалёўскі	19,6
Чэрыкаўскі	12,8
Крупскі	12,9
Горацкі	13,5
Чашніцкі	10,7
Старобінскі	8,8
Дрысенскі	14,6
Хойніцкі	15,1

Збожжазагатоўкі

Жлобіншчына здае тэмпы

Дэмабілізацыйным настроям—рашучы адпор

Абвясьцілі конкурс і... забыліся

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Тэмпы збожжазагатовак па раёне зьніжаюцца з кожнай пяцідзёнкай. За час з 6 па 15 лістапада прырост складае толькі 0,7 проц. Пірэйкі, Кабанаўскі, Бухарынскі, Чацьвярынскі, Затонскі, Дабрагашчанскі, Салонскі і Мормальскі сельсаветы за апошнія 10 дзён не загатовілі ніводнага кілё збожжа.

Асноўная прычына паслабленьня тэмпаў збожжазагатовак—гэта адсутнасьць масава-растлумачальнай работы, пакладаньне на самацёк. Чаго варта такая работа, калі толькі (пасьля Кастрычніцкіх сьвят) 17 лістапада былі накіраваны ў сельсаветы ўпаўнаважаныя ад райкому КП(б)Б і райвыканкому па правядзеньні збожжазагатовак?

Жлобінскі раён ў пачатку абвясьціў раённы конкурс на лепшае правядзеньне збожжазагатовак, але раённыя арганізацыі хутка забыліся пра конкурс, конкурсная камісія не працуе, лепшыя ўдарнікі загатовак не выяўляюцца, не папулярызуюцца. А яны ў раёне ёсьць. Некаторыя калгасы раёну набліжаюцца да поўнага завяршэньня, а паасобныя калгасы (калгасы Майскага, Окетнянскага, Кабанаўскага, Ст.-Рудзянскага сельсаветаў) зноў на перавыкавалі пляны збожжазагатовак.

Пры належнай пастаноўцы масавай работы можна дамагчыся рашучага ўзмацненьня збожжазагатовак. Гэта паказала выязная рэдакцыя раённай газэты «Шлях сацыялізму». Выязная рэдакцыя працавала больш дзкады ў найбольш адсталым сельсавеце—Дабрагашчанскім. Дзякуючы мабілізацыі актыву ўсяго сельсавету, разгортваньню масава-растлумачальнай работы, бязьлітаснаму выкрываньню кулацкіх махінацый, арганізацыі падворнага абходу—за гэты кароткі час прырост збожжазагатовак на сельсавеце павысіўся на 26 проц., у той час, калі ва ўсім сельсавеце за гэты перыяд прырост складаў толькі 7 проц.

Раённыя арганізацыі і сельсаветы Жлобіншчыны павінны рашуча павярнуцца тварам да збожжазагатовак. Трэба неадкладна выправіць дапушчэньні памылкі, ліквідаваць самацёк і бязьдзейнасьць.

Закрэўскі.

Наш адказ на пастанову ЦВК і СНК СССР

Зьнішчым прагулы

Пастанову ЦВК і СНК СССР «аб звальненьні за прагул без уважлівых прычын» рабочыя шпалернай фабрыкі імя Варошскага цалкам ухваляюць і абавязваюцца ўзмацніць барацьбу з лятунамі і прагульшчыкамі, якія тармозяць работу прадпрыемства.

Майстар пячатнага цэху тав. Барысэвіч адабраючы пастанову ЦВК і СНК БССР заявіў, што толькі гэтыя мерапрыемствы могуць зьнішчыць злосныя прагулы, якіх на нашай фабрыцы толькі за кастрычнік месяц 15. Тав. Барысэвіч адначасова патрабаваў, каб у выпадку звальненьня за прагул, прагульшчыка больш ня прымаць на работу.

У сувязі з апублікаваньнем пастановы, якая свячасова накіравана на зьнішчэньне прагулаў і лятунства, рабочыя шпалерной фабрыкі патрабавалі ад гаспадарнікаў і адпаведных мэдкамісій больш чулых адносін да патрэб рабочых, бо ёсьць выпадкі бюракратычных адносін да рабочых.

Рабочыя шпалернай фабрыкі імя Варошскага на сваіх мітынгах, прапрацоўваючы пастанову ЦВК і СНК СССР аб звальненьні за прагул без уважлівых прычын, абяцалі яшчэ ў большай ступені ўзмацніць барацьбу за працоўную дысцыпліну і даваць бязьлітасны адпор тым, хто імкнецца яе парушыць.

С.

З-за іх стаяць машыны

Шпаркімі тэмпамі крочыць наперад культура БССР. Адкрываюцца дзесяткі, сотні новых школ, розных культ-навучальных устаноў. Нябачанымі тэмпамі павялічваецца лік выпускаемых газэт—іх тыраж. Усё гэта высоўвае перад друкарнямі вялікую і адказную шчыю задачу—забясьпечыць патрэбы гэтага вялізнага ўздыму.

Але ў друкарні імя Сталіна ёсьць такія людзі пад назвай ПРАГУЛЬШЧЫКАЎ, якія сваімі сыстэматычнымі прагуламі і спазьненьнямі зрываюць выкананьне прамфінпляну, з-за якіх машыны прастойваюць месяцамі, днямі, гадзінамі.

Так, на віне адліўшчыка Хвайніцкага кніжная ратацыйная машына прастаяла 1½ гадзіны.

Сотні лістоў кардону чакаюць, каб іх парэзалі па стандартных формах і ператварылі ў вокладкі для кніг, таму што рэзчык кардону Тунік прагуляў за кастрычнік—лістапад 5 дзён, Дудзінская—3 дні.

Сотні тысяч лістоў засталіся не сфальцаванымі, яны ня могуць дачакацца чаргі, калі будуць ператорваны ў брашуры, кнігі, таму што Зігельштэйн прагуляў цэлы месяц.

У машынным цэху «Амэрыканка» 5 дзён чакала Сіроткінай, якая зрабіла пяцідзённы прагул.

Калі падагулім вынікі колькі работыя пераплётнага цэху друкарні імя Сталіна прагулялі, дык аказацца, што гэтая лічба дасягае 14 дзён, па машынным цэху—10. дзён. Гэта толькі лічбы за апошнія часы.

У сувязі з такім становішчам (якое наглядаецца ня толькі ў друкарні імя Сталіна, але і на іншых прадпрыемствах) ЦВК і СНК СССР выдалі пастанову аб звальненьні з работы за адна дзённы прагул без уважлівых прычын.

Прагульшчыкам—ня месца ў сацыялістычнай сыстэме.

Друкарня імя Сталіна павінна дамагчыся давядзеньня прагулаў да нуля. Гэта справа гонару і адвагі ўдарнікаў друкарні.

Прагульшчыкі—пляма чырвонаштандарнага заводу імя Варашылава

Рабочыя заводу імя Варашылава, заслухаўшы інфармацыю аб пастанове ЦВК і СНК аб барацьбе з прагульшчыкамі, ганьбяць усіх прагульшчыкаў, культаёў і п'яніц, якія зрываюць нармальнае выкананьне прамфінпляну.

«Яны зьяўляюцца плямай на сьветлым фоне таго вялікага сацыялістычнага будаўніцтва, якое разгарнулася ў нашым Савецкім Саюзе. Яны зьяўляюцца плямай нашага чырвонаштандарніка. Гэта пляма павінна быць змыта»

— Прагульшчыкам ня месца на чырвонаштандарным заводзе, — заявілі ў адзін голас рабочыя заводу імя Варашылава на адбыўшымся мітынгу.

* * *

Рабочыя работніцы, служачыя і ІТР абутковай фабрыкі імя Кагановіча, сабраўшыся на агульна-фабрычным мітынгу, адабраюць пастанову ЦВК і СНК СССР аб звальненьні за прагул без уважлівых прычын.

Зрыўшчыкам выкананьня пяцігодкі ў 4-ы гады, зрыўшчыкам выкананьня прамфінпляну і выкананьня плану выпуску прадукцыі (перспажыву (чым тармозіцца сустрэчны гандаль прамтаварамі), не павінна быць месца на нашай фабрыцы. Мы, рабочыя фабрыкі імя Кагановіча, ужыўём самыя рашучыя захады і давядзем самую бязьлітасную барацьбу з прагуламі.

Сярод нашага калектыву абавязуемся цалкам ліквідаваць прагулы і спазьненьні.

Кулацкія агенты зрываюць збожжазагатоўкі

РАГАЧЭЎ. (Наш кар.). Мы ўжо пісалі ў мінулым нумары нашай газэты аб тым, што па Аляксінскім сельсавеце кулацкія агенты зрываюць збожжазагатоўкі. Сёньня мы зьмешчаем допіс нашага карэспандэнта на гэтую-ж тэму. Факты сыгналізуюць аб засьмечанасьці раду сельсаветаў Рагачэўшчыны варожым элемэнтам.

Па Лучынскім сельсавеце збожжазагатоўкі па аднаасобным сэктары праходзяць вельмі марудна. Асноўная прычына ганебнага адставаньня гэтапоўная бязьдзейнасьць паасобных членаў сельсавету. Член сельсавету Я. Кутаеў (ён-жа і старшыня РСІ пры сельсавеце) ня толькі не мабілізуе масы на ўдарнае завяршэньне збожжазагатовак, а, наадварот, увесь час вядзе захавную кулацкую агітацыю серод найбольш адсталай часткі беднякоў і серадняковаў за невыкананьне самаабавязацельстваў па збожжазагатоўках. Сам Кутаеў да апошняга часу ня здаў (прадаў) ніводнага кілё збожжа.

Другі член сельсавету Брылёў К. таксама вядзе варожую работу сярод працоўных аднаасобнікаў за зрыў збожжазагатовак. Прэзыдыум сельсавету глядзіць скроз пальцы, як Брылёў і Кутаеў зрываюць загатоўкі і ня прымае ніякіх мер, каб прыцягнуць да адказнасьці кулацкіх падпявалаў.

На тых вучастках, дзе працуюць сумленныя, адданыя савецкай уладзе члены сельсавету, там мы маем станоўчыя вынікі. Гэта асабліва рэзка вызначаецца, калі параўнаць тэмпы збожжазагатовак на вучастках Брылёва і Кутаева і вучастках, дзе працуюць члены сельсавету Гарбатаў і Мармозаў. На вучастках апошніх значная частка бядняцка-серадняцкіх гаспадарак выканалі планы збожжазагатовак поўнасьцю, рэшта гаспадарак набліжаюцца да завяршэньня загатовак.

Раённыя арганізацыі павінны сур'ёзна заняцца праверкай работы паасобных работнікаў сельсавету. Мы сыгналізуем аб тым, што рад сельсаветаў Рагачэўшчыны засьмечаны кулацкімі элемэнтамі, якія тармозяць збожжазагатоўкі.

Кулешоў.

Замагільскі і Чырвона-Слабодзкі сельсаветы-адстаюць

Чырвоная Слабада. Тэмпы збожжазагатовак па раёне за апошнія дзесяць пяцідзёнкі не далі амаль пяткага аруху. Адставаньне тлумачыцца выключна няўменьнем увязваць збожжазагатоўкі з іншымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі, поўным ігнараваньнем масава-растлумачальнай работы.

Зусім не разгарнуліся збожжазагатоўкі па *Замагільскім і Чырвона-Слабодзкім* сельсаветах. Кіраўніцтва гэтых сельсаветаў цацкаецца з кулаком і ня прымае рашучых мер, каб спынець цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак (БЕЛТА).

За ГРАНІЦАЙ

Адстаўка ўраду Папена

БЭРЛІН, 17-XI. Паводле паведамлення Вольфа, Папен зрабіў сёньня дакład Гіндэнбургу аб выніках сваіх перагавораў з лідэрамі партый з мэтай стварыць шырокую «нацыянальную канцэнтрацыю». Паводле паведамленьня Вольфа, толькі нацыяналісты, «германская народная партыя і баварская народная партыя згадзіліся падтрымаць такую «нацыянальную канцэнтрацыю», цэнтр. і інш. адмовіліся ад падтрыманьня. Нацыянал-сацыялісты агаворвалі сваю гатоўнасьць весьці пісьмовыя перагаворы пэўнымі ўмовамі, прычым загадзя адмовіліся падтрымаць палітычную і эканамічную праграму, якая падрыхтоўваецца ўрадам. У выніку ўрад Папена падаў у адстаўку. Прэзыдэнт прыняў адстаўку і даручыў габінэту часова працягваць выкананьне сваіх абавязкаў.

Гіндэнбург вядзе перагаворы аб стварэньні ўраду „нацыянальнай канцэнтрацыі"

БЭРЛІН. 18-XI. Сёньня Гіндэнбург пачынае перагаворы з лідэрамі партый па пытаньні стварэньня ўраду «нацыянальнай канцэнтрацыі». На сёньня да Гіндэнбурга запрошаны старшыня партыі германскіх нацыяналістаў Гугенбэрг, старшыня партыі цэнтру Каас і старшыня народнай партыі Дынгельдэй. Назаўтра ў Гіндэнбурга прызначаны прыём Гітлера і старшыні баварскай народнай партыі Шэфэра. Сацыял-дэмакраты да перагавораў з Гіндэнбургам не залічаны, што матывуецца тонам і зьместам іхняга адказу на запрашэньне фон-Папэна.

Паводле паведамленьня «Дэйчэ Альгемэйнэ Цэйтунг» Гіндэнбург паставіў лідэрам партыі як абавязковую папярэднюю ўмову, каб новы ўрад быў таксама ўрадам прэзыдыяльным. Што датычыць пэрсанальнага складу, яго ўнутраной і эканамічнай палітыкі, партыі ня будуць зьвязаны з праграмай ураду фон-Папэна. У пытаньнях замежнай палітыкі, паводле слоў «Дэйчэ Альгемэйнэ Цэйтунг», павінен быць захаваны цяперашні курс.

Увесь друк ліцыць мала магчымым, каб Гіндэнбург згадзіўся даручыць Гітлеру ўтварэньне новага габінэту. Аднак, калі-б нават Гітлеру і было да ручана ўтварэньне новага ўраду, становішча яго было-б ускладнёна той акалічнасьцю, што астатнія партыі, а ў першую чаргу партыя нацыяналістаў, не згадзіліся працаваць пад яго кіраўніцтвам.

Пазіцыя партыі нацыяналістаў выкладзена ў апублікаванай сёньня дэкларацыі, у якой гаворыцца, што адстаўка ўраду фон-Папэна ня выклікана канечнай патрэбай, бо крызіс не ражываў ня ўрад, а партыі, што зма галіся супраць антыпарляманцкага прынципу, які адстойваў урад і партыя нацыяналістаў. У заключэньні дэкларацыя гаворыць, што партыя нацыяналістаў бачыць у Гіндэнбургу «гарантыю таго, што па-за залежнасьці ўрадавай тактыкі будзе працягвацца барацьба да перамогі супраць вэрсальскага прыгнечаньня і супроць бяз глузьдзіцы вэймарскай большасьці».

Сацыял-дэмакратычны «Форвэртс» у сёньнішнім перадавым артыкуле заяўляе, што калі ня ўдасца стварыць урад, які абапіраецца на парляманцкую большасьць, не даводзіцца пярэчыць і супроць прэзыдыяльнага ўраду. Аднак, сапраўдны твар фашыстаў выяўлены ў неразьлічаным на шырокія масы партыйным афіцыёзе «Сацыял-дэмакратышэр Прэсэдынст», які выступае супроць апублікаванага ўчора камунікэ аб дакладзе фон-Папэна Гіндэнбургу, дзе гаворыцца, што сацыял - дэмакратыя «рашуча адхіліла пажаданьні рэйхс-канцлера абмеркаваць з ім пытаньне аб яе ўдзеле ва ўрадзе «нацыянальнай канцэнтрацыі». «Гэта,—піша «Прэсэдынст»,—скажэньне сапраўднага становішча рэчаў. Сацыял-дэмакратыя адхіліла толькі перагаворы з фон-Папэнам, сэнс і мэта якіх наогул ня былі вядомы, і якія з прычыны ўстановак і папярэдніх дзеяньняў фон-Папэна павінны былі закончыцца крахам».

„Ротэ фанэ" аб адстаўцы Папена

БЭРЛІН. 18-XI. У перадавым артыкуле, прысьвечаным адстаўцы фон-Папэна, «Ротэ Фанэ» падкрэсьлівае, што ўход фон-Папена сьведчыць аб новым абастрэньні клясавай барацьбы ў Германіі. «Было-б памылкова і небясьпечна,—піша газэта,—спадзявацца на паслабленьне фашысцкага курсу буржуазіі. Іменна таму, што «прэзыдыяльны габінэт» Папена аказаўся бездапаможным перад тварам узрастаючай барацьбы шавіцкай хвалі, ён павінен быць замененым іншай камбінацыяй фашысцкіх сіл. Папен павінен выйсьці для таго, каб уступіць месца больш згуртаванаму аб'яднаньню ўсіх частак контрэвалюцыі.

Германскаму пралетарыяту пагражае новы штурм. Мае быць прыцягненьне ва ўрад нацыянал-фашысцкай тэрарыстычнай арганізацыі, канцэнтрацыя ўсіх фашысцкіх сіл з мэтай ліквідаваць выбарчыя правы, з мэтай рэфармаваць канстытуцыю, з мэтай правесьці далейшае зьніжэньне зарплаты і дапамогі і абвясьціць кампартыю па-за законам. Масавыя сілы пралетарыяту прымусілі Папена падаць у адстаўку. Але калі працоўныя масы хочуць жыць, дых у «адстаўку» павінна пайсьці ўся сыстэма».

Польшча просіць адтэрміноваць ньня даўгоў

ВАРШАВА. 19-XI. «Курэр Паранны» паведамляе, што Польшча ўжо тры месяцы назад зрабіла ў Вашынгтоне заяву аб адтэрмінаваньні яе плацяжоў. Газэта адзначае, што Польшчы патрэбна было 15 сьнежня зрабіць плацеж у суме 40 млн. злотых.

Узмацніць баяздольнасьць дэпутацкіх груп

для пасьпяховага правядзеньня паходу саветаў

Дэпутаты ф-кі імя Валадарскага павінны ўключыцца ў паход

МАГІЛЕЎ. Дэпутацкая група гарсавету магілеўскай швэйнай фабрыкі імя *ВАЛАДАРСКАГА* ў свой час была адна з перадавых Магілеўскага гарсавету. Яна ціка вілася ўсім жыцьцём фабрыкі і рабочай масы. Вакол гэтай групы быў згуртаваны савецкі актыў з лепшых ударнікаў вытворчасьці, які быў ўцягнуты ў актыўную практычную работу дэпутацкай групы і гарсавету. Амаль усе члены дэпутацкай групы разам з яе старшынёй былі гарсаветам прэм'яваны працыма і пачэснымі грамотамі.

Але дэпутацкая група не пайшла па шляху лягчэ большага разгортваньня сваёй работы, па шляху замацаваньня дасягнутага.

За апошні час дэпутацкая група стаіць у баку ад усіх важнейшых палітычна-гаспадарчых задач. Яе ня цікавіць пытаньне выкананьня прамфінпляну, у той час, калі фабрыка мае прарыў у выкананьні прамфінпляну.

Дэпутацкая група не займаецца пытаньнямі разгортваньня вырабу шыропажыву, як і пытаньнямі палепшаньня якасьці прадукцыі, работай школы ФЗВ, якая выробляе прадукты шыропажыву, таксама не займаецца і бытавымі пытаньнямі.

Вельмі радка дэпутацкая група праводзіць пасяджаньні бюро і пленумы дэпутацкай групы.

Не практыкуе дзяжурства дэпутатаў на вытворчасьці для прыёму заяў, скаргаў ад выбаршчыкаў. Дэпутацкая група за апошні час на вытворчасьці не адчуваецца.

Пры такой пастаноўцы работы дэпутацкая група не падрыхтавана для правядзеньня двухмесячніку паходу за рэалізацыю рашэньняў верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) па разгортваньні вырабу шырспажыву.

Трэба неадкладна дэпутацкай групе фабрыкі імя *Валадарскага* перабудаваць сваю работу так, каб забясьпечыць выкананьне задач пастаўленых паходам перад саветамі і іх масавымі зьвяньнямі—дэпутацкімі групамі і сакцыямі і перад кожным дэпутатам па асобку.

Дэпутацкая група фабрыкі мае добры савецкі актыў, мае шмат добрых ударнікаў, якія здольны сваім удзелам у практычнай рабоце забясьпечыць выкананьне ўсіх палітычна-гаспадарчых задач, па стаўленых партыяй і ўрадам перад рабочай клясай і ўсімі працоўнымі СССР.

Задача дэпутацкай групы—мабілізаваць актыўнасьць савецкага актыву і ўдарнікаў фабрыкі.

Максымум увагі дэпутацкія групы павінны зьвярнуць на пытаньні выкананьня пляну, вырабу шыропажыву, па скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў, садзейнасьць кустпромкааперацыі і разгортваньне вырабу шыропажыву, на ўзяцьце шэфства над арцелямі, садзейнасьць апошнім у атрыманьні імі адыходаў ад прадпрыемстваў для перапрацоўкі.

Дэпутацкая група фабрыкі павінна зараз-жа ўключыцца ў абвешчаны ЦВК двухмесячнік паходу за рэалізацыю рашэньняў верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) па разгортваньні вырабу та вараў шырокага спажываньня і дабіцца ў гэтым напрамку рэальных практычных вынікаў.

Трэба спадзявацца, што дэпутацкая група гарсавету магілеўскай швэйнай фабрыкі імя *ВАЛАДАРСКАГА*, мабілізаваўшы рабочыя масы і стаўшы на чале актыўнасьці іх, пад кіраўніцтвам партыйнай і прафэсіянальнай арганізацыі фабрыкі і прэзыдыуму гарадзкога савету, здольна будзе ажыцьцявіць усе пастаўленыя перад ёю задачы.

І.

Оргнарада ЦВК БССР

Пры арганістру ЦВК адбылася оргнарада. На нарадзе было спэцыяльна прапрацавана пытаньне аб практычным ажыцьцяўленьні пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР па правядзеньні двухмесячніку паходу саветаў і іх масавых зьвяньняў—сакцый і дэпутацкіх груп за рэалізацыю рашэньняў верасьнёўскага пленуму ЦК у галіне вырабу шыропажыву.

У ліку намечаных мерапрыемстваў па арганізацыйна-масавай рабоце вакол правядзеньня паходу прапрацавана пытаньне наладжваньня жывога інструктажу і сувязі з паасобнымі аб'ектамі.

Для дапамогі ў арганізацыі першага этапу паходу паасобным раёнам арганістрам ЦВК пасланы спэцыяльныя работнікі-інструктары ЦВК.

З ліку пасланых таварышоў выехала тав. *Эстрына* ў Барысаўскі раён, тав. *Мядзьведзеў*—у Асьвейскі, *Марцынкевіч*—у Любаньскі раён.

М.

ЛЁНАПРАДУКЦЫЮ—САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Адначасова з ПОЎНАЙ НАГРУЗКАЙ заводаў

задача саветаў—неадкладна разгарнуць апрацоўку лёну ручным спосабам

Аб ходзе першапачатковай апрацоўкі і загатоўкі лёну па БССР (у проц.)

	Газаслава	палабрава	Загат. лёнавалакна
На 10-XI .	95,4	81,6	10,6
На 5-XI .	94,9	77,9	9,2

Побач з перадавымі

Лепель. Перадавыя калгасы раёну на аснове правільнай арганізацыі працы, разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва дамагліся значных посьпехаў у галіне апрацоўкі тэхкультур. Так, у калгасе «Новае жыцьцё», Сьвяцкага сельсавету, апрацоўка лёну праходзіць ударнымі тэмпамі. Работа арганізавана ў дзьве зьмены. Паміж брыгадамі разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Калгас ужо здаў (прадаў) дзяржаве 3 цнт лёнавалакна.

Але побач з перадавымі ў раёне ёсьць шмат калгасаў, якія спачуваньня затрымваюць апрацоўку лёну. Так, калгас «Батрак», Каменскага сельсавету, да гэтага часу не абмалаціў уродзжай з 15 га лёну. Да апрацоўкі лёну калгас не падрыхтаваўся. Сушні не гатовы, дровы не падвезены, лёнамялкі не адрэмонтаваны. Дысцыпліна ў калгасе слабая, на работу выходзяць позна.

Такое-ж становішча з апрацоўкай лёну і ў калгасе «Каміндэрн». У гэтым калгасе сваленыя ў кучы лёнатраста расьцяваецца сьвяньнямі.

У калгасе «Саранковічы», Лужаўскага сельсавету, па-шкодніцку адносяцца да апрацоўкі тэхкультур. Праўленьне калгасу не пахлопацілася, каб свячасова падняць лён са сьцелішчаў, у выніку чаго згніў ураджай 3 га лёну.

Раённыя арганізацыі і сельсаветы абавязаны прыцягнуць да суровай адказнасьці праўленьні тых калгасаў, па чыёй віне тармазіцца апрацоўка лёну і псуецца лёнапрадукцыя. (БЕЛТА).

„Чырвоны Барацьбіт" да тэрміну выканаў плян

Любань. Калгас «Чырвоны Барацьбіт», Асавецкага сельсавету на справе паказаў бальшавіцкія тэмпы ў галіне апрацоўкі тэхкультур. Дзякуючы сацспаборніцтву і ўдарніцтву, у выніку правільнай расстаноўкі сіл, пагодзённаму кантролю з боку праўленьня, калгас 25 кастрычніка закончыў апрацоўку лёну. Лёнавалакно было адразу-ж здадзена (прадана) на загатоўчы пункт. Калгас выканаў плян загатовак на 136,4 проц.

Круглоў

Траста яшчэ ляжыць на сьцелішчах

Дрыса. Леназагатоўкі па раёне пра ходзяць недапушчальна марудлівымі тэмпамі. Плян па здачы (продажы) лёнапрасты выкананы ўсяго на 22 проц., лёна-семя—9 проц., лёнавалакна—5 проц. Гэта тлумачыцца яшчэ адной недаацэнкай тэхкультур з боку раённых арганізацый, большасьці сельсаветаў.

Па некаторых калгасах да апошняга часу траста ляжыць на сьцелішчах. Па калгасах імя Карла Маркса, «Усходняя зара», «Пралетары» (Таркавецкага сельсавету), імя Варашылава, Бігосіўскага сельсавету большая частка трасты гніе на сенажаці.

Адсутнічае нашэ на кучака. Цьвёрдыя заданьні з кучацка-заможных гаспадарак не спагнаюцца. Па Бігосаўскім сельсавеце заможнікі не здалі ні волнага кілё валакна. (БЕЛТА).

ЗВАРОТ ДА ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО СЬВЕТУ

амэрыканскай рабочай дэлегацыі

Мы, амэрыканская рабочая дэлегацыя, накіраваная ў СССР амэрыканскай яўрэйскай камуністычнай газэтай «Морген-Фрайгайт», прабыўшы ў СССР 16 дзён, наведалі 7 гарадоў і рад буйных волатаў-заводаў, рад культасьветных і адміністрацыйна-гаспадарчых устаноў.

Мы наведалі калыбель Кастрычніка, ка рэвалюцыі ў Ленінградзе—Смольны, азнаёміліся з Домам культуры Нарвскага раёну, дзіцячымі ясьлямі пры яўрэйскім рабочым клюбе, мы бачылі ў Маскве вялікі ўзьлёт працоўных мас СССР у часе дэманстрацыі, прысьвечанай XV гадавіне Кастрычніка, ка рэвалюцыі. Мы бачылі новую за ваёву—вынік першай бальшавіцкай пяцігодкі,—Дняпроўскую электрастанцыю. Мы бачылі волат індустрыі—Харкаўскі трактарны завод. Мы бачылі, як савецкая ўлада перавыхавала былую яўрэйскую беднату, людзей, якія ня мелі над сабой эканамічнай базы, ў актыўных удзельнікаў сацыялістычнага будаўніцтва, упягнуўшы іх у прамысловасьць і сельскую гаспадарку.

Вялізарнае ўражаньне выклікала ў нас камуна «Чырвоная зорка» пад Харкавам, калі мы азнаёміліся з жыцьцём яўрэйскага калгасьніка, калі мы ўбачылі дзіцячы дом імя Дзяржынскага, дзіцячую калёнію ў Малахагцы пад Масквой, школу дзіцячага дому ў Кіеве, калі мы ўбачылі, як ажыцьцяўляецца савецкая пралетарская рэвалюцыйная законнасьць яўрэйскай камерай Кіеўскага суда, калі мы ўбачылі як у Адэскім папраўчым доме, дзякуючы сапраўды правільнай пастаноўцы выхаваньня, злачынцы перавыхоўваюцца ў карысных грамадзян Савецкага Саюзу.

Усюды мы гаварылі непасрэдна з рабочымі, з прадстаўнікамі грамадзянасьці і ўлады, з дзецьмі і нават са зьняволенымі.

Усё, што мы бачылі, нас пераканала, што правільная палітыка партыі і ўраду ператварыла Савецкі Саюз—былую царскую Расію—з краіны аграрнай і адсталай, у індустрыяльна-аграрную, краіну перадавой тэхнікі. Усё будуецца для працоўных, усё будаўніцтва абгрунтавана на сацыялістычных асновах. Адно з вялізарнейшых дасягненьняў, якога рабочая кляса СССР ўжо дамаглася і якога немагчыма дабіцца ні ў адной капіталістычнай краіне—гэта культурныя ўстановы, дзіцячыя ўстановы і новыя сацыялістычныя гарады.

Мы ганьбім усе тыя выдумкі, пасклёпы і ману, якія распаўсюджваюцца ў Амэрыцы праз буржуазную і «сацыялістычную» прэсу пра Савецкі Саюз, і, у прыватнасьці, праз самую брудную з брудных моўтай прэсы—праз «Форвэрст» і т. п., на чые сродкі яна існуе.

Тыя труднасьці, якія зараз ёсьць у Савецкім Саюзе, ня былі ўтоены ад нас. Наадварот, яны былі падкрэсьлены яшчэ ў большай меры, чым яны ёсьць у сапраўднасьці ўсімі кіраўнікамі савецкіх арганізацый, з якімі давялося сустракацца. Мы гаварылі з рознымі прадстаўнікамі народнасьцей пра іх жыцьцё і мы знаходзім неабходным выказаць нашу думку: становішча рабочага ў Савецкім Саюзе шмат лепшае, як мы думалі раней і ў шмат разоў лепшае за тое становішча, у якім знаходзяцца дзесяткі мільёнаў працоўных ў краінах Эўропы, якія мы наведалі.

Мы выказваем нашу пралетарскую падзяку ўсім грамадзкім і прафэсіянальным арганізацыям Ленінграду, Масквы, і Харкаву, Адэсы, Кіеву і Менску за тыя таварыскія адносіны і дапамогу, якія былі нам аказаны для азнаямленьня з ўсім савецкім жыцьцём. Мы выказваем нашу падзяку нашай «Морген Фрайгайт» за арганізацыю экскурсіі.

Няхай жыве інтэрнацыянальнае адзінства рабочае клясы ўсяго сьвету!

Няхай жыве Савецкі Саюз—пралетарская бацькаўшчына сусьветнага пралетарыяту!

Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя!

(Ідуць подпісы ўсіх удзельнікаў делегацыі).

Па БССР

Да юбілею народнага паэты БССР—Якуба Коласа

У лістападзе гэтага году споўніцца 50 год з дня нараджэньня Якуба Коласа.

У адзнаку юбілею Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі выдае рад твораў Якуба Коласа на мовах нацменшасьцей. Арткамітэт саюзу савецкіх пісьменьнікаў Беларусі ў канцы лістапада арганізуе вялікі вечар, прысьвечаны літаратурнай і грамадзка-палітычнай дзейнасьці Якуба Коласа. Апрача гэтага Аргкамітэт сумесна з партыйнымі і савецкімі арганізацыямі правядзе вечары на буйнейшых фабрыках і заводах Менску з дакладамі аб творчым шляху Якуба Коласа.

Інстытут літаратуры і мастацтва АН БССР 10 лістапада заслухаў даклад тав. Барысёнка аб творчасьці юбіляра.

Кампанія зімовай дапамогі палітзьняволеным ідзе нездавальняюча

Ход кампаніі зімовай дапамогі палітзьняволеным за першыя дзьве дэкады зусім нездавальняючы. За гэты час паступіла ўсяго каля 10 тыс. руб. Значная частка МОПР'аўскіх арганізацый як Бабруйская, Дрысенская, Жыткавіцкая, Крычаўская ў гэтую кампанію не ўключыліся. Таксама дрэнна паступаюць членскія ўзносы За 2 дэкады ўсяго паступіла каля 5 тыс. руб.

Па-бальшавіцку масавую работу разгарнулі Віцебская, Гомельская і Менская МОПР'аўскія арганізацыі.

Для дапамогі ў правядзеньні кампаніі зімовай дапамогі ЦК МОПР'у гарыраў у адстаючыя раёны членаў ЦК і палітэмігрантаў.

Апэрацыйная тройка па кіраўніцтву КЗД наладжвае выязднае пасяджаньне ў Полацку і Мазыры. На гэтае пасяджаньне выклікаюцца прадстаўнікі МОПР'аўскіх арганізацый суседніх раёнаў.

За подпісам старшыні ЦК МОПР БССР тав. Домбаля і старшыні апэрацыйнай тройкі тав. Мятлы пасланы ліст партыйным, камсамольскім і прафсаюзным арганізацыям аб дапамозе ў правядзеньні КЗД.

Старыя рабочыя ўступаюць ў партыю Леніна

У адказ на заклік рабочых менскага заводу «Камунар» 24 старэйшых рабочых, лепшых ударнікаў Бабруйскай швэйнай фабрыкі падалі заявы аб уступленьні ў партыю. Апрача гэтага камсамольскі калектыў фабрыкі перадаў у партыю 22 лепшых камсамольцаў.

Заявы аб уступленьні ў партыю падалі ударнікі Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату. Першым падаў заяву 50-гадовы рабочы — выдатны ударнік тав. Пярлоў, які ў сваёй заяве піша, што ідзе «ў партыю Леніна для таго, каб прыняць актыўны ўдзел у пабудове сацыялізму»

Плян навігацыі 1932 году выкананы датэрмінова

ВІЦЕБСК (Белта). Водны транспарт Віцебскай прыстані ў гэтым годзе плян грузаперавозак выканаў датэрмінова на 20 дзён і на 102,3 проц. Перавезена 121741 тона грузу. Заданьне па перавозках пасажыраў выканана на 126,3 проц.

Ужо разгарнулася падрыхтоўка прыстані да зімовага судна-рамонту. Падрыхтаваны два затоны для паравога флёту ў Віцебску і Веліжы. Тэхнічны флёт (падводныя землячарпальні, вадаёмнікі і інш.). пастаўлены ў затон. Рамонтная майстэрня напалову забясьпечана матар'яламі, каляровым мэталем, жалезам, фанэрай. Але адчуваецца недахоп балтоў, гаек і цьвікоў. Вялікім недахопам зьяўляецца і тое, што на прыстані няма сталага зімовага затону для лайбаў, якіх на прыстані каля 80 штук.

У бліжэйшыя дні Віцебская прыстань будзе гатова да закрыцьця навігацыі 1932 году і расстаноўкі суднаў на рамонт.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Дэпутацкія групы НА ШТУРМ ПРАРЫВАЎ УЦІЛЬЦЭХАУ

Аб арганізацыі Вышэйшым саветам фізкультуры і ЦК ЛКСМБ ўсебеларускай эстафэты „за шырспажыў і збор утылю"

(Пастанова сакратарыяту ЦВК БССР)

1. Адобрыць ініцыятыву Вышэйшага савету фізкультуры і ЦК ЛКСМБ па арганізацыі і правядзеньні ўсебеларускай эстафэты «За шырспажыў і збор утылю», як адно з канкрэтных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні пастаноў верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б).

2. Прапанаваць усім райвыканкомам і гарсаветам аказаць канкретную дапамогу арганізацыям ФК і КСМ у правядзеньні ўсебеларускай эстафэты «За шырспажыў і збор утылю».

3. Прапанаваць Саюзутылю, Белкаапсаюзу, Белсэмпрамсавету і гаспадарчым арганізацыям аказаць усямернаю дапамогу ФК і КСМ арганізацыям у практычным ажыцьцяўленьні пастаўленых задач усебеларускай эстафэты «за шырспажыў і збор утылю».

4. Рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» сыстэматычна асьвятляць на старонках газэты ход разгортваньня і правядзеньня ўсебеларускай эстафэты.

5. Уліковаючы, што пастановай прэзыдыуму ЦВК БССР абвешчаны двух месячны паход саветаў з 10-XI—32 г. у галіне разгортваньня вырабу прадметаў шырспажыву, прапанаваць РВК і саветам увязаць правядзеньне гэтага паходу з правядзеньнем Вышэйшым саветам фізкультуры і ЦК ЛКСМБ усебеларускай эстафэты «За шырспажыў і збор утылю».

Сакратар ЦВК БССР

М. Гніляк.

Прыцягнуць да адказнасьці

Некаторыя адказныя раённыя работнікі Віцебшчыны ў асобе выканаўцаў рэвалюцыйнай законнасьці—народнага судзьдзі Абушкевіча, работніка райспажыўсаюзу Курыліна і прадстаўніка Скурсьндыкату—забаравілі прамкаапэрацыі рабіць загатоўкі сьвіных скур, абвінавачваючы загатоўцу Сандляра ў шкодніцтве і патрабуючы яму арыштам.

Гэтым актам вышэйпаказаныя асобы парушаюць дырэктыву ўраду аб правох сыстэмы прамкаапэрацыі па загатоўцы сьвіных скур.

Вінаватыя павінны быць прыцягнуты да адказнасьці Прамкаапэрацыя павінна атрымаць магчымасьць для загатоўкі сьвіных скур.

Брыгадэр газэты «Сав. Бел».

Катляроў.

Арцель імя Крупскай у барацьбе за шырспажыў

Пастановы партыі і ўраду аб перабудове арганізацыйных форм і мэтадаў работы прамкаапэрацыі далі магчымасьць арцелі вывяўляць сваю ініцыятыву і самадзейнасьць.

Гэтыя пастановы членамі арцелі імя Крупскай ператвораны ў жывыя канкрэтныя справы. Плян першага паўгодзьдзя выкананы на 123 проц., плян III кварталу на 102 проц. Брак у параўнаньні з 1931 годам зьнізіўся з 11 проц. да аднаго. Сустрэчным прамфінпляном выпушчана тавараў шырспажыву на 500 тыс. руб. Згодна рашэньня ўсесаюзнай конкурснай камісіі арцель імя Крупскай за дасягнутыя посьпехі атрымала першую прэмію.

У мэтах хутчэйшай рэалізацыі пастаноў партыі і ўраду аб прамкаапэрацыі, арцельшчыкі абавязваюцца на аснове больш рашучага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва і поўнай рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна—прамфінплян 4 завяршаючага году пяцігодкі і дадатковую праграму вырабу прадметаў шырспажыву выканаць не пазьней 20-XII—г. г.; за застаўшуюся дэкаду, яшчэ даць сустрэчны плян шырспажыву на 77 тыс. руб.; павялічыць тавараварот свайго розьнічнага магазыну; адкрыць на калгасным базары ларок для арганізацыі сустрэчнага гандлю прытаварамі; не дапускаць павышэньня базарных цэн; разьвярнуць тяжкую работу па самазагатоўках сыравіны; арганізаваць спэцыяльныя брыгады па зборы ўтылю; пры магазыне адкрыць пункт па прыёме ўтылю, мансыпальна скарыстоўваць утыльадходы і гэтым самым павялічыць праграму вырабу тавараў шырспажыву. Узмацніць кантроль над выпускаемай прадукцыяй, увёўшы кляймёньне яе. Брак давесьці да нуля.

У мэтах пасьпяховага выкананьня ўзятых на сябе абавязацельстваў, у арцелі разгарнулася новая хваля сацспаборніцтва і ўдарніцтва і арганізацыя новых гаспадарча-разьліковых брыгад. Арцель абавязалася:

Перабудаваць культмасавую работу на выкананьне прамфінпляну; ліквідаваць цалкам няпісьменнасьць сярод арцельшчыкаў; весьці сыстэматычную культыхаваўчую работу, ахапіўшы кожнага арцельшчыка якім-небудзь гуртком; штодзённа правяраць узятыя на сябе абавязацельствы, змагаючыся за выкананьне кожнага пункту ў пасобку.

Арцельшчыкі упэўнены, што пад кіраўніцтвам партячэйкі, згуртаваўшы яшчэ шчыльней свае рады вакол камуністычнай партыі, яны з узятымі абавязацельствамі справяцца.

Арцель заклікае ўсіх арцельшчыкаў Беларусі пасьледаваць яе прыкладу. Арцель будзе змагацца ў радох лепшых за шырспажыў, за савецкі гандаль, за хутчэйшы тавараварот, за генэральную лінію партыі.

Ліпніцкі.

ГУЛАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня

Ад 14 лістапада Мастацкі фільм **Снайпэр** (Нямы вярыянт) У гал. ролях: Афіцэр Б. Шліхцінг, салдат П. Соболеўскі. Рэж. Цімашенка. Зьвыш праг. кіно хроніка Саюзкіно

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз.

Дуглас Фэрбэнкс **Сын Зора** (Новы экзэмпляр)

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь" **патрэбна** на дзённую і сталую работу **МАШЫНІСТКА,** якая добра ведае беларускую мову

Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі. Сэктар кнігагандлю

Вышаў з друку, рассылаецца падпісчыкам і паступіў у продаж ва ўсе кнігарні ДВБ **том II твораў У. І. ЛЕНІНА на белмове**

Таксама ёсьць у продажы том III, IV, V.

Кіраўніцтва сетак і п-станцый „БЭЛЭНЭРГА" даводзіць да ведама пакупнікаў і пастаўшчыкоў, што яно з 1-га лістапада г г. **ПЕРАЕХАЛА** з пасёлку ВЫДРЫЦА, Аршанскага раёну БССР **у г. Віцебск,** вул. Калініна, дом № 22.

Разьліковыя рахункі ў Віцебскім аддзяленьні Дзяржбанку па Эксплёатацыі № 1886 і па будаўніцтве № 1889. Тэлеграфны адрас: Віцебск, „БЭЛЭНЭРГА".

Кіраўніцтва

Даводзіцца да ведама ўсіх арганізацый і прадпрыемстваў, што БЕЛЖЫЛБУДСНАБ І ЯГО АДДЗЯЛЕНЬНЕ ПА БССР з 21-XI 1932 г. **ЛІКВІДУЕЦЦА**

Арганізаваная Цэнтральная ліквідацыйная камісія распачала работу з 17-XI 1932 г.

Для ліквідацыі АДДЗЯЛЕНЬНЯЎ БЕЛЖЫЛБУДСНАБУ, па раёнах 23-XI 1932 г. будуць арганізаваны раённыя ліквідацыйныя камісіі.

Прэтэнзіі ад прадпрыемстваў, арганізацый і прыватных асоб прымаюцца Цэнтральнай ліквідацыйнай камісіяй па Менску з 21 XI па 11-XII 32 г.

Прэтэнзіі да раённых аддзяленьняў БЕЛЖЫЛБУДСНАБУ будуць прымацца адпаведнымі раённымі ліквідацыйнымі камісіямі.

Цэнтральная ліквідацыйная камісія зьмяшчаецца па Інтэрнацыянальнай вуліцы, дом № 12 (БЕЛЖЫЛСАЮЗ).

ЛІКВІДКОМ.

Згодна пастановы СНК СССР ад 8 кастрычніка г. г. № 1549 і загаду ЦІТЭІН АргСО ад 1 лістапада г. г. № 144. Беларускае Аддзяленьне ЦІТЭІН АргСО з 25 лістапада г. г. **ЛІКВІДУЕЦЦА.**

Усе ўстановы, прадпрыемствы і асобы, якія маюць прэтэнзіі да Аддзяленьня, павінны прадставіць іх не пазьней 25 лістапада г. г. па адрасе: Менск, Чырвонаармейская вул. № 16, Кіраўніцтву Упаўнаважанага НКЦП. Сэктар тэхпрапаганды, тэл. 14—59.

Кір. упаўн. НКЦП.

Даводзіцца да ведама ўсіх прадпрыемстваў, арганізацый, а таксама прыватных асоб, што 7 дарожна-будаўнічы вучастак з 10 лістапада **ЛІКВІДУЕЦЦА.**

Арганізаваная ліквідацыйная камісія, якая будзе працаваць з 20 лістапада па 5 сьнежня 1932 г. Усім прадпрыемствам, арганізацыям і прыватным асобам, якія маюць прэтэнзіі, зьвяртацца ў Ліквідком 7 дарбудвучастку да 5 сьнежня 1932 г. Пасьля паказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

Нач. 7 дарбудвучастку Крукоўскі.

ЗГУБЛЕНЫ

Пасьведчаньне, выд., Менскім мэдінстытутам—Белазарцавай К. А., кв. 1752.

Пасьведчаньне аб скончэньні Барэзінскай 7-годкі—Ігнатовіч Т., кв. 1753.

Пасьведчаньне аб скончэньні Сынілаўскай школы Хмыс В. А., кв. 1754.

Партбілет, выд. Менгаркомам за № 0815049—Цыгалка Ф. З., кв. 1755.

Квіт аб здачы на папраўку гадзіньніка—Пазьняковаў А. Г., кв. 1756.

Партыйна-кандыдацкі білет, выд., Менгаркомам за № 642200—Пархомчык М. Л., кв 1757.

Членскі білет, выд. Менгаркомам—Хаеня К. Н., кв. 1758.

Парт-кандыдацкі білет, выд., Менгаркомам за № 604—Прэйс С. Л., кв. 1759.

Партызанскі білет, выд., Карасьценскім Ваенкаматам—Гейхман Ш. Э., кв. 1760.

Партбілет, выд., Менгаркомам за № 1624608—Горгель М. Г., кв. 1761.

Парт-кандыдацкі білет, выд. Гомельскім гаркомам—Меркоўм Х. Н., кв. 1762.

Квіт. аб здачы на папраўку гадзіньніка № 6065—Лісэр У. М., кв. 1763.

Атэстат аб скончэньні курсаў дорожных дзесятнікаў—Цыпаткоў А. М., кв. 1764.

Партбілет, выд., Менгаркомам, № 162097—Сталяроў Т. К., кв. 1765.

Камсамольскі білет, выд., Бранскім райкомам, № 0750—Рошкаў Е. І., кв. 1766.

Пэнсіённая кніжка, выд. Менстрахкасай—Каравае ва Н., кв. 1767.

Студэнцкі білет, выд., Менгарсаветам—Гар. І. Х., кв. 1770.

Парт-кандыдацкая картка, выд. Менгаркомам за № 431—Батура А. Я., кв. 1772.

Партбілет, выд. Віцебскім акружкомам, № 1109885—Юхнавец В., кв. 1773.

Партбілет, выд., Аршанскім гаркомам, № 0802065—Сарэер Я. Н., кв. 1775.

Упав. Галоўлітбелу А—54.

Друкарня імя Сталіна